Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-06-01

Канферэнцыі

# «Звязда»: гісторыя Айчыны

**У Інстытуце гісторыі НАН Беларусі адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя на тэму "Газета "Звязда" ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі — да 95-годдзя заснавання і 70-годдзя першага выхаду "Звязды" ў гады Вялікай Айчыннай вайны".**

**Кацярына БЯДУЛІНА**

"Гісторыя "Звязды" непарыўна звязана з гераічным мінулым нашай краіны. Старонкі газеты — дакладны і праўдзівы летапіс жыцця беларускага народа. Газеце належыць адметная роля ў станаўленні і развіцці беларускіх друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, фарміраванні высокіх традыцый нацыянальнай журналістыкі, выхаванні цэлай плеяды выдатных прафесіяналаў", — гаворыцца ў прывітальным лісце міністра інфармацыі Беларусі А. Праляскоўскага. Таксама старэйшую газету Беларусі павіншаваў намеснік міністра інфармацыі У. Матусевіч.

У працы канферэнцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, Беларускага саюза журналістаў, гісторыкі, палітолагі, журналісты, мовазнаўцы і літаратуразнаўцы.

Сярод выступоўцаў былі Май Данцыг, народны мастак Беларусі, прафесар, унук Герца Данцыга, у друкарні якога ўбачыў свет першы нумар газеты "Звязда", і Галіна Каржанеўская, дачка мінскага падпольшчыка, распаўсюджвальніка падпольнай "Звязды" Мікалая Каржанеўскага.

Таксама слова ўзялі акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў Даніловіч і інш.

Адно з галоўных пытанняў, што ўзнімалася падчас канферэнцыі, — "Звязда. Ад мінулага да сучаснасці: што змянілася, што засталося?"

— Сёння газета "Звязда" — гэта захаванне культурнай спадчыны нашага народа, — выказаў думку галоўны рэдактар Алесь Карлюкевіч. — На яе старонках адлюстраваны працэсы, што адбываюцца ў грамадстве, культуры Беларусі. Гэтак жа, як чалавек павінен ведаць пра асноўныя падзеі, што адбываюцца ў свеце, ён мусіць ведаць і сваю мову, і гісторыю краіны, у якой нарадзіўся і жыве.